# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СМАЧНА ЕСЦІ!

## Халаднік. 5 незвычайных рэцэптаў

**1. На сыракваашы**



***Спатрэбіцца:*** *на літр сыракваашы — 3 яйкі, 3 агуркі, па пучку кропу, пятрушкі, кінзы, зялёнай цыбулі, 1 зубок часнаку, соль, перац.*

Агуркі і яйкі дробна парэзаць, зяленіва дробна пасекчы, усе інгрэдыенты высыпаць у сыракваашу. Пасаліць, паперчыць, для вастрыні дабавіць здробнены часнок.



**2. З агародніны**

***Спатрэбіцца:*** *на паўтара літра хлебнага квасу — 6-7 вараных бульбін, 3 вараныя яйкі, вараная морква, пучок радыскі, 3 агуркі, цыбуліна, 2 стваловыя лыжкі смятаны, кроп, на смак — соль, цукар, гарчыца.*

Агуркі, радыску, бульбу, моркву нарэзаць, нашаткаваць кроп. Жаўткі расцерці са смятанай, гарчыцай, а бялок пасекчы і дабавіць у асноўную масу, развесці халодным хлебным квасам. Атрыманай сумессю заліць падрыхтаваную гародніну.

**3. Зборны**



***Спатрэбіцца:*** *на паўтара літра хлебнага квасу — 200 г адварной цяляціны, 200 г вяндліны, 5 агуркоў, 2 вараныя яйкі, 3 стаповыя лыжкі смятаны, хрэн, соль, зяленіва.*

Дробна нарэзаць мяса, вяндліну, агуркі і яйкі. Пасечанае зяленіва пасаліць і патаўчы, старанна перамяшаць з хрэнам і невялікай колькасцю смятаны. Усе інгрэдыенты змяшаць, заліць квасам. Падаваць са смятанай.



**4. На скорую руку**

***Спатрэбіцца:*** *на паўтара літра халоднай вады — лімон, 3 вараныя яйкі, 2 агуркі, пучок радыскі, на смак — смятана, зяленіва, соль, перац.*

Нарэзаць яйкі, агурок, радыску, дадаць пасечанае зяленіва і смятану, усё старанна перамяшаць. Атрыманую сумесь раскласці па талерках, заліць халоднай вадой з лімонным сокам.

**5. Грыбны**



***Спатрэбіцца:*** *на паўтара літра хлебнага квасу — 300 г марынаваных грыбоў, 200 г вараной ялавічыны, 6 вараных бульбін, 1 вараная морква, 2 вараныя яйкі, 2 свежыя агуркі, стаповая лыжка гарчыцы, 2 стаповыя лыжкі смятаны, па пучку кропу, пятрушкі і зялёнай цыбулі.*

Грыбы памыць халоднай вадой, даць сцячы вадзе, затым нарэзаць на дробныя кубікі, дабавіць здробненыя ялавічыну, агурок, моркву, бульбу. Жаўткі расцерці з гарчыцай і невялікай колькасцю смятаны, а бялок пасекчы і ўкінуць у асноўную масу. Падрыхтаваную сумесь заліць квасам, заправіць жаўткамі з гарчыцай, пасечаным зяленівам, пасаліць.

ЧЫСЦЮЛЯ

## СЕЗОН БЕЛАГА

**Як правільна мыць летняе адзенне**

*Перш за ўсё рассартуйце яго па відах тканіны і прачытайце надпісы на этыкетках.*

Белае

Не забывайце правіла: белае мыць асобна ад каляровага. Нават пастэльна-ружовы можа ператварыць белую сукенку ў шэрую. Аптымальная тэмпература пры мыцці тканін з віскозы ці з прымессю сінтэтыкі — 30 градусаў. Ад занадта гарачай вады такія рэчы пашарэюць. Як пры ручным, так і пры машынным мыцці белае рэкамендуецца замочваць у цёплай вадзе з парашком на 4-5 гадзін. Пажоўклыя рэчы можна адбельваць з дапамогай спецыяльных сродкаў, а таксама старым правераным спосабам — перакісам вадароду. Для гэтага ў вядры цёплай вады трэба растварыць 3 ст. л. перакісу. Замачыць рэчы на дзве гадзіны, пасля двойчы прапаласкаць і павесіць сушыцца на сонцы. Сонечныя прамяні — выдатны натуральны адбельвальнік.

З бавоўны



Баваўнянай бялізне можна вярнуць першапачатковы выгляд з дапамогай замочвання на суткі ў аднаўляльным растворы — па 4 ст. л. пральнага парашку і шкіпінару на кожныя 10 л вады.

З лёну

Ільняныя рэчы трэба замочваць двойчы. Спачатку ўсяго на паўгадзіны, у цёплай вадзе з пральным парашком. Затым ваду зліць, бялізну адціснуць і замачыць зноў — яшчэ на паўгадзіны. Белыя льняныя рэчы мыюць у машыне пры 60 градусах. Каляровыя — пры 30-40 °С. Каб рэч не аблезла, у ваду дабаўце соль — 1 ст. л. на кожныя 10 л вады. Лён будзе менш садзіцца пасля мыцця, калі сушыць яго не ў машыне, а на паветры. Белыя льняныя рэчы можна адбельваць і бабуліным спосабам — кіпячэннем. На 10 л вады — 10 г парашку і 10 г адбельвальніку. Трэба давесці да кіпення і пакінуць на 20 хвілін. Затым як след прапаласкаць, выкруціць і павесіць.

Футболкі з малюнкам

Рэчы з прынтам неабходна мыць навыварат. Абавязкова прачытайце надпісы на парашку — ніякага адбельвальнага эфекту! Калі на футболцы з малюнкам ёсць пляма, можна выкарыстоўваць толькі плямавыводнікі з кіслародам. Футболкі з заводскім малюнкам смела мыйце ў машыне ў рэжыме далікатнага мыцця. Але рэчы з фотапрынтамі — толькі ўручную. Аціскаць толькі рукамі, не выкручваючы. Нельга зацiскаць прышчэпкамі малюнак.

Як вывесці плямы?

✓ Тлустая пляма. Акрамя ўсім вядомай солі, першая дапамога пры такім забруджванні — крэйда. Трэба яе растаўчы і пасыпаць пляму. Ці проста пацерці крэйдай брудное месца. Яна ўбярэ частку тлушчу, а астатні потым лёгка адмыецца ў гарачай вадзе.

✓ Пляму ад травы можна выдаліць нават з белага адзення. Намачыце забруджанае месца спіртам або гарэлкай і пакіньце на 10 хвілін. Затым прапалашчыце рэч у халоднай праточнай вадзе і памыйце з парашком і адбельвальнікам.

✓ Пляма ад лаку і касметыкі. Найлепшы плямавыводнік пры такіх забруджваннях — вадкасць для зняцця лаку або гаспадарчы растваральнік.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.39 | 21.46 | 17.07 |
| Віцебск — | 4.20 | 21.44 | 17.24 |
| Магілёў — | 4.28 | 21.36 | 17.08 |
| Гомель — | 4.35 | 21.23 | 16.48 |
| Гродна — | 4.56 | 21.59 | 17.03 |
| Брэст — | 5.06 | 21.50 | 16.44 |

**Месяц**

*Поўня 20.06—26.06. Месяц у сузор'і Рыб.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Ганны, Андрэя, Арсенія, Івана, Пятра, Сціпана.* ***К.*** *Люцыі, Эленаворы, Максіма.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**25 ЧЭРВЕНЯ**

**1852** год — нарадзіўся Антонія Гаўдзі, славуты іспанскі архітэктар. Гаўдзі з дзяцінства пакутаваў на рэўматызм, які перашкаджаў яму гуляць з іншымі дзецьмі. Але хвароба не была перашкодай доўгім адзінокім прагулкам, да якіх ён меў прыхільнасць усё сваё жыццё. Абмежаваная з-за хваробы рухомасць абвастрыла назіральнасць будучага архітэктара, адкрыла яму свет прыроды, які стаў галоўнай крыніцай натхнення. Стыль, у якім тварыў Гаўдзі, адносяць да мадэрну. Аднак фактычна ў сваёй творчасці ён выкарыстоўваў элементы самых розных стыляў, творча іх перапрацоўваючы. Усяго за сваё жыццё архітэктар стварыў больш за 20 архітэктурных шэдэўраў. Многія з іх уключаны ў пералік Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Гэта і Саграда Фамілія — сабор Святой Сям'і ў Барселоне (1891-1926), і вінныя склепы Гуэля (1895-1898), і Парк Гуэля (1900-1914), і Дом Бальё (1904-1906), і Дом Міла (1906-1910). Яго жыццё скончылася трагічна — ён трапіў пад колы трамвая каля гары Цібідаба побач з працай, на якую ён патраціў 27 гадоў жыцця, — саборам Святой Сям'і ў Барселоне. Яму было 74 гады.



Дом Бальё.

**1905** год — нарадзіўся (вёска Пуцілкавічы, цяпер ва Ушацкім раёне) Пятрусь Броўка, народны паэт Беларусі, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы. У 1918-1928 гадах быў на савецкай і партыйнай рабоце; адказным сакратарам газеты «Чырвоная Полачычына». У 1941-1942 гадах працаваў у франтавой газеце «За Савецкую Беларусь», супрацоўнічаў у партызанскай прэсе. У 1945-1948 гадах — рэдактар часопіса «Полымя», у 1948-1967-м — старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, у 1967-1980-м — галоўны рэдактар «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі». Аўтар кніг паэзіі «Пахне чабор», «А дні ідуць», «І днём і ноччу ...» і інш. Памёр у 1980 годзе.

**1941** год — 75 гадоў таму войскі 13-й арміі Заходняга фронту пачалі абарону Мінска. Ваенныя камісарыяты горада накіравалі ў войскі каля 27 тысяч мабілізаваных. 25 чэрвеня 3-я нямецкая танкавая група пад камандаваннем генерал-палкоўніка Г. Гота, якая наступала з боку Вільні, выйшла на подступы да Мінска з поўначы. 26-27 чэрвеня з брэсцкага напрамку да сталіцы Беларусі прарвалася таксама 2-я танкавая група (генерал-палкоўнік Г. Гудэрыян). У паласе Мінскага ўмацаванага раёна па рубяжы Стайкі — Заслаўе — Дзяржынск — Станькава абараняліся войскі 64-й і 108-й стралковых дывізій, Дзяржынскі пагранічны атрад. Расцягнутыя больш чым на 100 км, яны не змаглі стварыць суцэльнага фронту, іх абарона мела характар асобных вузлоў супраціўлення на верагодных кірунках прарыву праціўніка. Найбольш зацятыя баі ішлі ў раёне вёсак Грыні, Мацкі, Ашнарова, Ломшына, Рогава, якія некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. У раёне Радашковіч здзейснілі подзвіг лётчыкі капітаны М.Ф. Гастэла, А.С. Маслаў, старшы лейтэнант І.З. Прэсайзен, якія накіравалі свой падбіты самалёт-бамбардзіроўшчык на скопішча варожай тэхнікі і жывой сілы. У той жа дзень урад Беларусі пераехаў з Мінска ў Магілёў.

**Было сказана**

**Люба ТАРАСЮК, паэтка:**

*«Уся зямля — адзін стары курган,
Куды сышліся нашых продкаў продкі».*

## УСМІХНЕМСЯ

Варатар футбольнай каманды — трэнеру:

— Чаму вы мяне трымаеце ў запасе?

— Запас галоў не прапускае.

**Хто-небудзь! Растлумачце жанчынам, што калі ты напіўся пасля сваркі — гэта доказ кахання і душэўных перажыванняў, а не тое, што ты «алкаголік і брудная, абыякавая скаціна».**

Грузчыкі разгружаюць мэблю, лаянка стаіць незвычайная — васьміпавярховая, са складанымі канструкцыямі, незвычайнымі суфіксамі... Жанчына, якая праходзіць міма, кажа іх брыгадзіру:

— Слухайце, я чула, вядома, як людзі часам лаюцца, але каб так...

— Гэта мы аспірантаў-філолагаў на падпрацоўку ўзялі.




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2431.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 24 чэрвеня 2016 года.